ПОСТАЦІ

**Эмануіл Іофе**

# ЯГО НАЗЫВАЛІ ЎНІКАЛЬНЫМ БЕЛАРУСКІМ ПІСЬМЕННІКАМ

*Да 130-годдзя Максіма Гарэцкага*

30 гадоў таму назад, 18 лютага 1993 года, па рашэнні ЮНЭСКА ўвесь свет адзначаў 100-годдзе таленавітага беларускага пісьменніка і вучонага Максіма Гарэцкага. Гэта азначае, што яго можна назваць беларускім пісьменнікам з сусветным імем. У свой час, адказваючы на пытанне анкеты аб прафесіі, Максім Іванавіч пісаў, што ён лічыць сябе «літаратарам, педагогам і навуковым работнікам». Пяты том 18-томнай «Беларускай энцыклапедыі» (Мн., 1997) называе М. І. Гарэцкага беларускім пісьменнікам, літаратуразнаўцам, публіцыстам, фалькларыстам і грамадскім дзеячам. А яшчэ можна дадаць, што ён — класік беларускай літаратуры першай паловы XX стагоддзя, арыгінальны празаік, таленавіты беларусазнаўца, гісторык беларускай літаратуры, лексікограф, краязнаўца, літаратурны і тэатральны крытык, педагог, выдавец-рэдактар, майстар мастацкага перакладу, дзеяч беларускага нацыянальна-дэмакратычнага адраджэння.

Хоць аб жыцці і дзейнасці Максіма Гарэцкага ўжо выдадзены кнігі Дзмітрыя Бугаёва, Алеся Адамовіча, Таццяны Дасаевай, Тэрэзы Голуб, Івана Чыгрына, Міхася Мушынскага, Радзіма Гарэцкага, Алеся Марціновіча, Уладзіміра Ліўшыца і іншых даследчыкаў, апублікаваны сотні артыкулаў у газетах, часопісах і навуковых зборніках, да сённяшняга дня ёсць яшчэ нямала малавядомых старонак яго біяграфіі. Мэта дадзенага артыкула — раскрыць некаторыя з іх. У гэтым аўтару дадзеных радкоў дапамогуць архівы і музеі Беларусі, Расіі і Літвы, перыядычны друк Беларусі, Польшчы і Літвы 1917-2023 гадоў, сустрэчы са сваякамі М. І. Гарэцкага — Галінай Гарэцкай, Ларысай Гарэцкай, акадэмікамі Гаўрылам і Радзімам Гарэцкімі, з літаратуразнаўцамі Дзмітрыем Бугаёвым і Міхасём Мушынскім.

Асаблівая ўвага ў нашым артыкуле будзе ўдзелена першаму этапу мінскага перыяду жыцця Максіма Гарэцкага (1923—1926), яго рабоце і дзейнасці ў Беларускім дзяржаўным універсітэце і Інстытуце беларускай культуры.

Максім Гарэцкі разам з сям'ёй у канцы кастрычніка 1923 года пераехаў з Вільні (Польшчы) у Савецкі Саюз, дакладней, у сталіцу ССРБ — горад Мінск.

У адным з інтэрв'ю дачкі рэктара БДУ Уладзіміра Пічэты, Ксеніі Уладзіміраўны, аўтару гэтых радкоў у Маскве ў 1970 годзе яна паведаміла, што, калі яе бацька даведаўся аб пераездзе ў Мінск Максіма Гарэцкага ў 1923 годзе, ён запрасіў яго на працу на рабочы факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Праз шмат гадоў дачка пісьменніка Галіна Гарэцкая нагадвала:

«У канцы кастрычніка 1923 года пасяліліся мы ў Мінску на Савецкай вуліцы насупраць гарадскога сквера. Жылі ў невялікай камунальнай кватэры на трэцім паверсе. Два пакоя мелі...

У Мінску выкладаў ён (М. Гарэцкі. — *Э. І.*) беларускую мову і літаратуру на рабфаку БДУ, у Камуністычным універсітэце БССР (з верасня 1925 года гэта яго асноўная праца) і нейкі час — у ветэрынарным тэхнікуме» [1, с.35].

Так здарылася, што гэта сцвярджэнне Галіны Максімаўны аб выкладанні бацькам беларускай мовы і літаратуры на рабфаку БДУ ўвайшло ва ўсе

энцыклапедыі БССР і Рэспубліні Беларусь. На самай справе, ніхто з аўтараў кароткіх біяграфічных справак не ўвёў у навуковы зварот наступнае сцвярджэнне брата Максіма Іванавіча — Гаўрылы Іванавіча з успамінаў «Слова пра брата і настаўніка»:

«Максім працаваў у Інстытуце беларускай культуры і на рабфаку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе выкладаў гісторыю беларускай літаратуры» [1, с.12].

Прыезд таленавітага беларускага пісьменніка стаў падзеяй у жыцці жыхароў сталіцы БССР. Неўзабаве ў часопісе была надрукавана наступная інфармацыя:

«У кастрычніку-месяцы прыехаў з Вільні ў Менск вядомы беларускі пісьменнік М. Гарэцкі. У Менску ён заняты выкладаннем на рабочым факультэце Беларускага універсытэту, асабіста працуе над складаньнем новага курсу «Гісторыі беларускай літаратуры» па заказе Камісарыяту Асьветы. Максім Гарэцкі таксама гатовіць да друку зборы сваіх белетрыстычных твораў» (захаваны правапіс таго часу. — Э. І.) [2].

Так здарылася, што яшчэ раней Уладзімір Пічэта запрасіў на пасаду выкладчыка беларускай мовы і літаратуры на педагагічны факультэт БДУ Канстанціна Міцкевіча (Якуба Коласа). Цікава, што працаваць у Беларускім дзяржаўным універсітэце М. Гарэцкі і Я. Колас пачалі амаль адначасова — у пачатку лістапада 1923 года.

А ў пачатку 1924 года Максім Гарэцкі і Якуб Колас арганізавалі гурток беларускай культуры на рабфаку БДУ. На жаль, хоць прайшло амаль стагоддзе, а гісторыя і дзейнасць гэтага гуртка беларускімі культуролагамі і літаратуразнаўцамі даследавана вельмі павярхоўна.

Вядома толькі, што старастай гуртка быў Іван Нікіфаравіч Марук (Янка Марук), а сакратаром — Валерыян Іванавіч Валога. З астаўшыхся ў жывых членаў гуртка ў першай палове 1970-х гадоў аўтару гэтых радкоў удалося адшукаць толькі І. Л. Сацункевіча і Х. Р. Райнера.

Ураджэнец вёскі Маконь Ігуменскага павета Мінскай губерні (цяпер Чэрвеньскі раён Мінскай вобласці) Іван Лявонавіч Сацункевіч (1904—1989 гг.) праз 7 гадоў (у 1931 годзе) скончыў БДУ. З 1932 года ён знаходзіўся на кіруючай рабоце ў Мінску. З 1939 года Сацункевіч працаваў першым сакратаром Заслаўскага райкома партыі, а потым — сакратаром Мінскага абкама КП(б)Б. У гады Вялікай Айчыннай вайны Іван Лявонавіч стаў адным з арганізатараў і кіраўніком антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на Міншчыне. У 1946—1953 гадах працаваў наркамам, міністрам лёгкай прамысловасці БССР. І. Л. Сацункевіч у 1947—1951 гадах быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Ён таксама вядомы як аўтар двух выданняў кнігі «Суровая быль».

У гутарцы з аўтарам гэтых радкоў Іван Лявонавіч прыгадваў:

«На занятках нашага гуртка беларускай культуры чыталі лекцыі і вялі гутаркі вядомыя дзеячы беларускай культуры. Максім Гарэцкі і Якуб Колас запрашалі на сустрэчу з намі Янку Купалу, Цішку Гартнага, Змітрака Бядулю, Міхася Чарота, Уладзіслава Галубка, Фларыяна Ждановіча, Алеся Якімовіча, іншых беларускіх паэтаў, празаікаў, тэатральных дзеячаў. Мы сустракаліся з народным камісарам асветы БССР Усеваладам Ігнатоўскім. Многае, зразумела, згладзілася з памяці. Прайшло ўжо амаль паўстагоддзя, але я добра памятаю, што мы разбіралі некаторыя мастацкія творы з удзелам саміх аўтараў. Такія заняткі значна павышалі наш кругагляд і гонар за беларускую культуру ў цэлым і за беларускую літаратуру ў прыватнасці. Важнасць і каштоўнасць заняткаў нашага гуртка заключалася ў тым, што яны прывілі нам, тагачасным рабфакаўцам, любоў да беларускай культуры, асабліва да беларускай літаратуры і беларускага тэатральнага мастацтва. Шчыра кажучы, тыя веды, якія далі мне заняткі гуртка беларускай

культуры, былі скарыстаны мной на працягу многіх гадоў і былі карысны ў маёй далейшай працы».

Адным са студэнтаў рабфака БДУ ў 1920-х гадах быў будучы кіраўнік народнага драматычнага калектыву БДУ (1949—1956), майстар эпізоду, таленавіты беларускі акцёр Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Кузьма Львовіч Кулакоў (1901—1979). Праз шмат гадоў, у 1978 годзе, ён у артыкуле «На рабфаку ўніверсітэта» ўспамінаў:

«Не магу я сёння не ўспомніць свайго блізкага і чулага настаўніка, дзякуючы якому 55 гадоў таму назад звязаў сваё жыццё з тэатральным мастацтвам, бо ён адзін з першых прышчапіў мне любоў да тэатра. Гаворка будзе пра майго настаўніка — пісьменніка, публіцыста і вучонага Максіма Іванавіча Гарэцкага. Яго імя, яго воблік я заўсёды ўспамінаў і ўспамінаю і ў цяжкія, і ў харошыя мінуты жыцця.

З першых сваіх лекцый на рабфаку М. Гарэцкі заваяваў сімпатыі рабфакаўскай аўдыторыі, стаў адным з самых любімых нашых настаўнікаў. Ён пакінуў незабыўны след у памяці многіх нашых выпускнікоў і колькі разоў мы, рабфакаўцы, на доўгія гады, што прайшлі пасля нашага з ім знаёмства, ні сустракаліся, заўсёды ўспаміналі пра яго першага…

Гэта быў не толькі выкладчык, настаўнік — гэта быў сябар і просты ў абыходжанні таварыш. Ён быў душой рабфака.

У яго вуснах беларуская гаворка гучала як музыка. Ён дасканала ведаў беларускі фальклор — беларускія песні і танцы, беларускую народную творчасць, казкі, прыказкі, прыгаворкі, касцюмы, арнамент, вельмі любіў тэатр.

Рабфакаўская аўдыторыя заўсёды з вялікай цікавасцю слухала лекцыі Максіма Іванавіча, таму што яны былі даступныя, надзвычай змястоўныя і цікавыя формай выкладу. Яго лекцыі былі заўсёды напоўнены яркімі вобразнымі прыкладамі, тонкім гумарам.

Ён быў страсным і таленавітым прапагандыстам беларускай літаратуры і мастацтва… Ён далучаў нас да мастацтва тэатра, кіно, музыкі, жывапісу. Хадзіў з намі на спектаклі, канцэрты, у музеі.

Перад кожным паходам у тэатр, кіно, на канцэрты або музей Максім Іванавіч на сваіх занятках знаходзіў час, каб расказаць сюжэт п'есы, біяграфію драматурга, кампазітара, мастака, раскрыць ідэйны змест твора.

…Ён быў ініцыятарам творчых сустрэч з беларускімі паэтамі, празаікамі, драматургамі. На рабфаку па яго ініцыятыве наладжваліся літаратурна-мастацкія вечары, на якіх прысутнічалі Я. Купала, Я. Колас, М. Чарот, З. Бядуля, Ц. Гартны.

На гэтых вечарах запрошаныя пісьменнікі і паэты чыталі свае творы, а рабфакаўцы выступалі з рэфератамі, у якіх быў крытычны разгляд творчасці нашых гасцей. На гэтых вечарах рабфакаўцы, удзельнікі самадзейнасці, члены гуртка мастацкага слова чыталі вершы і прозу запрошаных, а маладыя студэнты-паэты Я. Рак, Сапун, Дакучыц і іншыя чыталі свае вершы…

Максім Іванавіч прышчапіў нам любоў да літаратуры і мастацтва. Ён навучыў нас слухаць музыку, любіць песню і танец, разбірацца ў мастацтве тэатра. Таму вобраз яго застаўся ў маёй памяці на ўсё жыццё» [1, сс. 82–84].

Між іншым, менавіта пад уплывам Максіма Гарэцкага ў 1926 годзе Кузьма Кулакоў скончыў Беларускую драматычную студыю ў Маскве і стаў прафесіянальным артыстам, які працаваў у шэрагу тэатраў Беларусі.

Хоць Максім Гарэцкі не стаяў ля вытокаў Інстытута беларускай культуры і яму не давялося стаць адным з яго арганізатараў, ён з радасцю прыняў вестку аб адкрыцці Інбелкульта ў канцы студзеня 1922 года. Справа ў тым, што ў ноч

з 19-га на 20 студзеня 1922 года Максіма Іванавіча арыштавалі і пасадзілі ў адзіночную камеру на Лукішкі.

Пасля пераезду ў Мінск на пастаяннае жыхарства ў 1923 годзе Максім Гарэцкі, як паведаміў аўтару гэтых радкоў яго брат, акадэмік АН БССР Гаўрыла Гарэцкі, ён пачаў удзельнічаць у секцыйнай рабоце Інстытута беларускай культуры.

16 студзеня 1925 года пастановай Наркамата асветы БССР Максім Іванавіч быў зацверджаны правадзейным членам Інбелкульта [3]. 4 лютага 1925 года рашэннем Прэзідыума Інстытута беларускай культуры Слоўнікавую камісію ІБК узначалілі М. Гарэцкі і М. Байкоў [4]. 8 лютага 1925 года на агульным сходзе Інбелкульта была абрана Слоўнікавая камісія. Яе старшынёй (часова) быў прызначаны М. Гарэцкі [5].

9 лютага 1925 года адбылося пасяджэнне Прэзідыума Інбелкульта, дзе слухалася пытанне аб фарміраванні секцый, на якім прысутнічаў і Максім Гарэцкі. Згодна пратаколу № 3 гэтага пасяджэння, было прынята рашэнне, што ён узначаліць мовазнаўчую і літаратуразнаўчую секцыі Інстытута беларускай культуры [6].

15 лютага 1925 года адбылося пасяджэнне Правапісна-тэрміналагічнай камісіі Інбелкульта ў складзе Я. Лёсіка, М. Азбукіна і К. Міцкевіча. У пастанове гэтага пасяджэння адзначалася, што камісія «знаходзіць пільна патрэбным пашырыць свой склад новымі сябрамі». Для работы ў дадзенай камісіі было вырашана запрасіць Я. Купалу, М. Гарэцкага, У. Чаржынскага і інш. Аб гэтым сведчыць пратакол № 1 пасяджэння Правапісна-тэрміналагічнай камісііі [7].

У сакавіку 1925 года правадзейны член Інстытута беларускай культуры М. Гарэцкі па сумяшчальніцтве быў прызначаны навуковым сакратаром літаратурнай камісіі Інбелкульта [8].

30 сакавіка 1925 года адбыўся агульны сход членаў Інбелкульта. На гэтым сходзе быў зацверджаны склад Літаратурнай камісіі. Яе старшынёй быў выбраны Іван Замоцін, а сакратаром — Максім Гарэцкі. Акрамя таго, у склад Навуковай рады Інстытута беларускай культуры былі дадаткова абраны К. Міцкевіч (Я. Колас) і М. Гарэцкі [9].

28 мая 1925 года адбылося ўрачыстае пасяджэнне літаратурнай секцыі Інбелкульта, прысвечанае 20-годдзю літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы. Адным з самых цікавых было выступленне Максіма Гарэцкага. Праз некалькі дзён газета «Савецкая Беларусь» пісала:

«...Добра і падрабязна высветліў ролю Янку Купалы ў беларускім нацыянальным адраджэнні пісьменнік Максім Гарэцкі. Па яго прапанове сход ушанаваў маці і жонку песняра, якія прысутнічалі на ўрачыстасці» [10].

У фондах Літаратурнага музея М. Багдановіча захоўваецца цікавы дакумент пад назвай «Даклад І. І. Замоціна "Літаратурная камісія Інбелкульта ў працэсе працы над зборам твораў М. Багдановіча. Падрахункі і перспектывы"» (не пазней 12лістапада 1925 года). У ім ёсць такія радкі:

«1. Склад камісіі.

Камісія пачала працу ў складзе старшыні камісіі праф. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта І. І. Замоціна і сакратара М. І. Гарэцкага ў палове сакавіка м[есяца] гг. Першы месяц пайшоў на састаўленне плану працы камісіі, на выпрацоўку каштарыса і на асобныя заданні, як напрыклад, складанне праграмы для сабірання народнае творчасці....

З 1 чэрвеня з складу камісіі выбыў і т. Гарэцкі.

3. Самы працэс працы камісіі адбываўся ў наступным парадку. Па-першае, была расчытана пачка рукапісаў, абгарэўшых у час пажара ў Яраслаўлі... Дзякуючы *працы* М. І. Гарэцкага, часткова і Ул. Дубоўкі, камісія *расчытала* гэтую частку

рукапісаў і не без вынікаў была адрэдагавана для друку больш за дваццаць новых (яшчэ да цяперашняга часу нявыдрукаваных вершаў) Багдановіча, з якіх частка *зусім* закончаных, а *іншыя толькі* эскізы (нарысы) не пазбаўленыя аднак мастацкага значэння... Расчытванне папкі № 1 было пачата М. І. Гарэцкім, але *ў хуткім часе* было пакінута з прычыны выхаду яго са складу камісіі» [11].

Такім чынам, 1 чэрвеня 1925 года Максім Гарэцкі выйшаў са складу Літаратурнай камісіі Інбелкульта, у якой ён выконваў абавязкі навуковага сакратара.

Вялікі рэзананс сярод аматараў беларускага фальклору выклікаў даклад Максіма Гарэцкага «Зьбіраньне і апрацоўка фальклёру» 9 лютага 1926 года на першым Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе. Прывядзём толькі два фрагменты гэтага даклада:

«Дасьледаваньне і апрацоўка нашых вусных твораў шмат чаго вытлумачыць нам у гісторыі культуры — як агульнай, так і нашай, і дасць нам належныя падставы ў справе гістарычнай паэтыкі.

Гэта дасьледаваньне раскрые нам сутнасць самабытна-беларускай паэтычнай творчасці. Яно будзе дапамагаць нашым паэтам і пісьменнікам тварыць і працаваць пабеларуску з належнай тэарэтычнай сьвядомасцю і тэхнічнай дасканаласцю. Яно высьвятліць наш фальклорны матэрыял так, што і школа наша зможа карыстацца ім у належнай меры і з належным падыходам» (захаваны беларускі правапіс таго часу. — *Э. І.*) [12. с. 56].

Вельмі важна, што на гэтым з'ездзе была прынята «Рэзалюцыя па дакладзе т. Гарэцкага аб збіранні і апрацоўцы фальклору» з 8 пунктаў, рэалізацыя якой садзейнічала дэталёваму вывучэнню фальклору ў БССР.

Творчая спадчына Максіма Гарэцкага — гэта, безумоўна, гонар беларускай культуры.

**Спіс літаратуры**

1. Гарэцкая, Г. Наша сям'я / Г. Гарэцкая // Максім Гарэцкі : успаміны, артыкулы, дакументы. Мн. : Маст. літ., 1984 — 366 с.
2. Часоп. «Полымя». 1923.№ 7–8.
3. Абвеснік НКА БССР. — № 4 ад 1 сакавіка 1925 г.
4. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей — ЦНА НАН Беларусі).Ф. 67. Воп. 1. Спр. 8).
5. ЦНА НАН Беларусі, Ф. 67. Воп. 2. Спр. 12.
6. ЦНА НАН Беларусі, Ф. 67. Воп. 2. Спр. 9. Арк. 4.
7. ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Спр. 9.
8. Абвеснік НКА БССР № 4. Ад 1 сакавіка 1925 г. (З»Трудового списка»).
9. ЦНА НАН Беларусі.Ф. 67. Воп. 1. Спр.12.
10 Савецкая Беларусь, 1925. — 1 чэрвеня. — № 121.
11. Літаратурны музей М. Багдановіча. КП 8990. Машынапіс з праўкамі В. Ф. Мачульскага фіялетавым чарнілам.
12. Працы першага Усебеларускага краязнаўчага звезда 7–11 лютага 1926 года // Мн. : Выданне Інстытута беларускай культуры (Цэнтральнае бюро краязнаўства. Аддзел V. Серыя V. Кн.1 ., 1926. — 83 с.